БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.
Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб., на апошняй —60 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 71. Менск. Чэцьвер 20 чэрвеня 1918 г. Год I

Зьвязь с правінцыяй.

«Калі гара ні ідзець да Магамэта, то Магамэт ідзець да гары». Калі с прычын браку почты і нормальнаго жалезнадарожнаго руху члены Рады Б. Н. Р. ні маглі уладзіць пастаяннай зьвязі с правінцыяй (з мясточкамі і вёскамі), то с правінцыі пачалі яўляцца у Раду з усіх куткоў Беларусі «хадакі»: з Магілёушчыны, Віцебшчыны, Гомэльшчыны, Палесья, Вілейскаго павету і розных мейсц. Зусюль прывозяць пастановы аб прызнанні ўласьці Народнаго Сэкрэтарыяту і просьбы наладзіць жыцьцё.

Народ інстынктыўна чуе патрэбу меці зьвязь с той ўласьцю, якая выйшла з яго сямьі, —як праняг беларускіх дэеяў Усебеларускаго зьезду, на якім было прадстаўнікоў з розных куткоў Беларусі болей 1500 чалавек.

Пасьля большэвіцкаго віхорнаго навадненья, калі сялянскае жыцьцё цяпер болей-меней убіраецца у свае звычайныя рамкі, наступае пэрыод адбудавання краю. Гэто самае адбудаванне вымагае напружэння організованых сіл па усей нашай зямлі пад кіраўніцтвам цэнтра—Рады Б. Н. Р.

На першую чаргу працы гэтаго наладжывання жыцця відочна чакае беларускі народ ад Рады Б. Н. Р. Як пачнецца гэта ніадкладная работа адбудавання побач с культурнай працай па часьці нацыянальных школ і экономічных прагрэсіўных спраў, тады даверье беларускаго народу да свайго цэнтральнаго органа іншчэ болей павялічыцца і праца пойдзе шпарка і пладавіта.

Гэты пачатак зьвязі с правінцыяй трэба як кольвек развіваць у шырокія размеры, трэба знаёміць вялікія массы беларускаго народу з нашай нацыянальнай ідэяй, з ідэяй нізалежнасьці Беларускай дзержавы, каторая кіруець да палепшэння добрабыту па ўсяму таксю у цэлым. Па усіх паветах, паласьцёх і вёсках трэба каб на чале стаялі людзі асьвядомленыя болей-меней у беларускіх справах, каторыя спынялі бы шкодную работу тых антыбеларускіх агітатароў, якія стараюцца і па сягоняшні дзень шкодзіць беларускаму адраджэнню як мага і чым мага.

І тады толькі, як гэта ўсё будзе паладжэна,—цэнтральны орган Беларускай дзержаўнасьці зробіцца тым жыватворным цэнтрам, ад якога пойдуць карысныя промені да ўсяго беларускаго пароду.

З. Б.

Агульныя весткі.

КІЕУ. Апублікована украінска-расійская мірная умова. Вертаючымся дамоў пазваляецца браць с сабой: 10000 руб. галаве сямьі і па 2000 руб. кожнаму члену сямьі, але ні больш 20000 руб. на усю сямью. У паадзінокіх прыпадках гэная сума можэ быць павялічэна да 100000 руб., калі семья зліквідавала ўсё сваё мепне. Далей устанаўліваюцца супольныя камісіі дзеля абмену тавараў, абмен вагонамі і паравозамі на чыгунках, аднаўленне тэлеграфных, пачтовых і жалезнадарожных зносін і назначэнне консулаў.

КІЕУ [В.Т.Б.] На апошнім агульным заседанні мірных дэлегатаў прыступілі да гутаркі аб справе граніц. Прадстаўнікі савецкаго ўраду дамагаліся агульнай свабоднай падачы голасу народам (плебісцыту) па этнографічнай аснове. Украінскія дэлегаты годзіліся на плебісцыт толькі ў паадзінокіх здарэннях, калі ен ні закранае агульна-дзержаўных інтарэсаў. Да разьвязкі дагэтуль ні дайшлі.

КІЕУ (В.Т.Б.) Б. чарнігаўскі маршалак шляхты, Іван Товстолес, назначэн за першаго сэкрэтара украінскаго пасольства у Бэрліне.

КІЕУ. Палажэнне кубанскіх казакоў ізноў пагоршылося. Яны адступаюць на Тамань.

МАСКВА. Французкая іскровая тэлеграма с 6 чэрвеня наказывае, што расійскім войскам ў Францыі даецца поўняя воля вярнуцца у Расію. На жаль, Расіі дагэтуль ні ўдалося дабіцца павароту сваіх войск дамоў. Расійскія салдаты, якія ні хочуць паступаць у расійскія легіоны, ўселяк прасьледуюцца, а такжэ масамі высылаюцца у Афрыку.

ВЭРЛІН.. Пяты ўсерасійскі зьезд саветаў зьбярэцца 28 чэрвеня у Маскве. У будучыні конгрэсы будуць адбывацца кожын год. Яны маюць за задачу выбіраць спаўніцельныя камітэты або пацьверджаць леташнія. Конгрэсы выяўляцімуць найвышэйшую палітычную ўласьць народу.

МАСКВА. Па загаду ураду ў Маскве і у цэнтральнай Расіі стрэлкі гадзіннікаў перасунены на 2 гадзіны ўперад.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. Міністэр судоў Халіл-бэй, вёўшы перэгаворы ў Батуме, вярнуўся. Перэгаворы далі магчымасьць палажыць канец ваенным чыннасьцям. Далей перэгаворы будуць адбывацца ў Константынопалі, бо аканчацельна мірная умова іншчэ ні падпісана.

КОНСТАНТЫНОПАЛЬ. С прычыны англельскаго наступлення ў Пэрсіі мы ўмацоваліся наабапал возера -Урміі і занялі Таўрыз.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Урадова. Імпэратар паслаў Насьледніку тэлеграму, успамінаючы, што пад яго камандай арміі Бэн'а, Бэлёв'а і Гутье разьбілі ворагоў, узялі 85.000 палонных і больш за 1000 гармат. «Я высказываю ад сваўго імі і ад імі Бацькаўшчыны падзяку начальнікам і войску. „Дух і сіла маіх войск забаспечываюць аканчацельную пабеду«.

МАДРЫД. З Вашынгтону послана нота амэрыканскаго ўраду, ў каторай апошні жаліцца на не спаўнення Гішпаніей прынятых на сябе павінасьцей. Амэрыканскі ўрад даў гішпанскім караблём пазваленне на вываз бавоўны, алею і газаліну, каторыя, як амэрыканскаму ўраду напэўна вядома, атрымліваюць ад іх нямецкія падводныя лодкі. Гішпанскія газэты пратэстуюць проці гэтых заяў і дамагаюцца апублікавання умовы, паводлуг каторай гішпанскі ўрад абязаўся дастаўляць прадукты амэрыканскаму войску у Францыі. Умова гэная ў сваім часі зроблена без згоды парламэнту.

РОТТЭРДАМ. Англіцкі ўрад закупіў увесь аўстралійскі ўраджай бавоўны на час вайны і іншчэ на год пасьля канца вайны.

БАЗЭЛЬ. Рух у порце Марсель с прычыны падводнае вайны шмат паменшаў. Прывоз даў толькі 499.000 тонн летась проці 688,000 тонн у 1916 гаду.

СОФІЯ. Міністэр-прэзыдэнт Радославов падаўся у адстаўку. Кароль прыняў яе, але загадаў міністрам спаўняць свае чыннасьці да назначэння новаго габінэту.

БЭРЛІН. «Berl Lokalan». Быўшы пасол расійскай Гас. Думы. Ічас прыбыў у Кіеў як поўнамочны прэдстаўнік Літоўскай Краевой Рады [Тарыбы].

Весткі з Расіі.

— Кіеу 15/VI. Згодна «Кіеўскай Мысьлі», рух паўстання казакоў Донскай вобласьці проці большэвікоў усе болей расшыраецца. Большая часць Ніжне-Чырскаго павету перайшла да новаго ураду с Красновым на чале. Войскі Краснова падыходзяць да Царыцыну.

Беларускае жыцце.

Масква. Беларускі нацыянальны камісарыят, які с 14 лютаго г. г. выэкспэнсаваў ужо 100000 рб., ні лічучы пэнсыяў агромнаму штату афіцыялістаў (каля 50 чалавек), пачаў ліквідаваць губэрнскія установы Гродзеншчыны і Віленшчыны. Напр. на першы пачатак ліквідуецца ведамы і карыстаючыся вялікай спагаднасьцю грамадзянства «Зьвязак Грамадзян Гродзенскай губ.» які знайходзіўся у Пецярбургу і ведаў помаччу уцекачом.

Гэта у той час калі дзесяткі тысячаў уцекачоў мучаюцца у Калуге, Тамбове, Вітэбску, Оршы і дарэмна удаюцца у бездзейны Камісарыят з сваімі просьбамі аб падмогах.

Кіеу. У Кіеві арганізаваўся нацыянальны Беларускі Камітэт дапамогі уцекачом.

У ліку, тых хто пачаў арганізацыю камітэту знайходзяцца ведамые беларускія дзеячы у Кіеві. Прэдстаўнікі Камітэту зьвярнуліся с просьбай да Украінскаго Ураду аб падтрыманні і спаткалі надта прыхільны да сябе стасунак. Камітэт прызнаны Украінскім Урадам праўным органом дапамогі бел.-уцекачом. У бліжэйшым часе будуць разгледжаны яго сьметы і зроблены ассыгноўкі, на пачатковыя выдаткі камітэт атрымаў аванс які залічыцца пры ассігноўках на сьметы.

Беларускай арганізацыяй на тэррыторыі Украіны 21 красавіка г. г. адчынены Тэхнічны Аддзел, які злучае беларусаў тэхнікаў, работнікаў і служачых па усім спэцыяльнасьцям, якія знайходзяцца без мейсц і работы. Аддзел зьвязаны з усімі прамысловымі і работніцкімі арганізацыямі м. Кіева. Праз Бюро Працы пры аддзеле пастаўлено на службу каля 300 і на службу 4 чалавекі. Пры аддзелі адчыняюцца курсы рысовання і крэсьлення.

Полтава. Поўнамоцнікам тутэйшай упекачоўскай арганізацыі адчынена рэгістрацыя уцекачоў у м. Полтаві. У першы дзень зарэгістровано болі за 500 чалавек.

Па ведамасьцям поўнамоцніка у Полтаві і паветах ёсьць да 20000 беларусаў-уцекачоў.

На беларускім шляху.

Нацыянальнае пытанне у Гомельшчыне.

«Насколькі ні блізкае па-

цыянальнае пытанне да народу,—піша яг. ікс-эм у «Б. Э.» —відаць с таго, што на апошнім селянскім зьездзі у Гомлі у сакавіку г.г. ні ўдалася хітрая махінэрыя п.п. земцаў аб прылучэнні Гомля і Гомяльскаго павету да Украіны і ні прайшла запрапанаваная ад імені павятовай земскай управы ўзглаўляемой некім п. Горовым рэзалюцыя аб прылучэнні да Украіны, ні зважаючы на ўсе высілкі п.п. спагадчыкаў. Бышы на зьездзі прэдстаўнік Белар. Соц. Грамады яг. Нецецкі ні зачапляючы суці пытання самаазначэння, аднымі гісторычнымі спраўкамі здолаў зьвярнуць селян з утоптанай дарогі, у скутку чаго была вынесена пастанова лічыць пытанне аб самаазначэнні адкрытым да выяснення і падробнаго асьвятлення яго у Менску і Кіеві»-

Намесьнік Нар. Сэкрэтарыяту.

За намесьніка Сэкрэтарыяту ў Гомельшчыне і Палўдзенна-Усходнім Пялесьсі назначан І. Нецецкі, арганізатар беларускіх культурна - прасьветных таварыств у Магілеўшчыне. Намесьніку даюцца правы акружнаго камісара; усе яго чыннасьці будуць спаўняцца у згодзі і паводлуг інструкцыі Народнаго Сэкрэтарыяту.

Новы член Рады.

Бабруйская Паветовая Рада назначыла ад сябе за члена Рады Беларускае Народнае Рэспублікі ў Менску свайго старшыню, Усьпенскаго.

У пытанні аб беларускім універсытэці.

Рада Беларускай Рэчы Посполітай зьвярнулась да пр. М. В. Доўнар-Запольскаго с прозьбай дапамагчы стварэнню беларускаго універсытэту у Менску.

Праф. М. В. Доўнар - Запольскі даў сваю прынцыпіяльную згоду, але даў Радзе некольні запытанняў, выясьненне якіх мае важнае значэнне для справы. Гэтыя пытання такія:

1) Есьць пажаданым: паразумецца з земствамі і местамі і выясніць наскольні гэтыя установы зацікаўлены у стварэнні універсытэту і ці могуць фундаваць яго; 2) Даць належачае умешканне для універсытэту; 3) саставіць біблотэку і сабраць ведамасьці аб стара-дрэўніх рэчах. 4) ўвайсьці у перагаворы с Кіеўскім універсытэтам сьв. Владіміра аб звароце біблотэкі і коллекцыяў Віленскаго універсытэту а так сама ні адчыненай біблотэкі гр. Аполінар Міхалаевіча Хрэптовіча - Бутенёва; 5) Выясьніць ці можа быць адведзены пляц зямлі і лесу для дасьвядчальнаго поля і агранамічнаго факультэту, а так само пляцы для батанічнаго і зоологічнаго садоў; 6) Правясьці праз Раду, земствы і месты пастанову, што універсытэт карыстае для студэнтаў, прафэсараў і служачых правамі (пэнсіонныя правы); 7) Адчыніць: а) гісторычна-філологічны факультэт з двама аддзеламі - гістарычным і гісторычна- літэратурным, в) юрыдычны, е) коммэрц.-экономічны; а) лекарскі, е) богословскі; 8) адчыніць адначасно народны універсытэт і прыпяць да яго прафэсараў; 9) у будучым годзе адчыніць першыя курсы; 10) запрашаць проф. ураджэнцаў Беларусі робячы выпяткі для выдатнейшых вучоных.

Для практычнаго выканання пытання аб універсытэці пр. Доўнар-Запольскі прапануе стварыць камітэт с прафэсароў і скомунікавацца с проф. ураджэнцамі Беларусі: Карскім, Завітневічам, Лаппо, Жуковічам і інш.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

«САБОТАЖНІК».

«Дэкрэтам ураду у Маскве і Ц. Расіі стрэлка гадзінніка пасунута на 2 гадз. уперад».

З газэт.

Ні было большэвікоу,—
Бацька-час жыу нізалежна
Пасярод гадоу, вякоу,
Валадар быу ніабмежны.

* * *

Ад мінут, гадзін і дзен,
Тыдняу, месяцау з гадамі,
Над усесьветам правіу ен
Зволвна ходзючы векамі.

* * *

А прыйшлі большэвікі
Зараз рэчы стан зьмяніуся:
Валадар і цар такі
Легка час ім пакарыуся.

* * *

Круцяць самі, як хаця,
Стрэлкі жвава у загарку,
Як свавольнае дзіця,—
Час ідзець для іх ні шпарка.

* * *

«Стары дурэнь ты, крычаць—
Што паузеш ты гэтак ціха?
Што? Закон такі... Маучаць!
Усе тваі законы к ліху.

* * *

Проста ты стары гультай,
Ці буржуям ты прадажнік
Н-ну! Пашоу-жа, ні чакай
Палкі, саботажнік!»

Сальвэсь.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Делегацыя ад служачых губ. казначэйства была у кірауні чаго казеннай палатай і прасіла аб павялічэнні істнуючай у іх нормы пэнсіі (большэвіцкай) ад 75% як цяпер, да 100%.

Хадатайство, мабыць, будзе уважэно.

У бонавых крамах выдача хлеба за апошнія дні, ні гледзючы на паніжэнне пайка, ідзець усеж такі кепска.

Большасьць крам адпускае хлеб з вялікім апазданнем.

Консісторыя стаушы у апазіцыю да уладыкі Гэоргія у адносінах скліканія у ліпні епархіяльнаго зьезду духавенства, у апошнія дні „зьмягчылася“.

Рэшано як нібудзь склікаць зьезд, дзеля таго што на павестцы дня стаяць вельмі важныя пытанні, глаунае аб рэформе мейсцовых духоуных школ і прафэсіанальна-прававым становішчы сьвяшчэнаслужыцялеу.

Б. менскі паліцмэйстар Сокалоу, вядомы ужо камэрцыйнымі камбінацыямі у Харбіне апошнім часам, як паведамляюць у меськай управе, адчыніу у названым месьці вялікае табачнае прэдпрыемство.

Да яго у супрацоунікі прабіраецца знаменіты менскі русіфікатар і кіраунік органа Шміда „Минское Слово“—крэшчоны Мэндэль Шоффэр.

Крадзежы і грабежства апошняго часу, як паведамляюць афіцыяльныя асобы крымінал-паліцыі, стаяць у зьвязі з астаткамі уцекачоу Царства Польскаго.

Апрача таго ім памагалі некаторыя з уволеных цяпер ніжэйшых агэнтау міліцыі.

Склад названай крымінал—паліцыі, а затым асабістай пры ваенным паліцмэйстры, усе палепшанай, гарантуюць зьменьшэння прэступнасьці у месьці у блізкім будучым.

Канцэрт Агрэневай-Славянскай пры учасьці хора, з арыямі з опер, песьнямі расійскімі, беларускімі, украінскімі і інш., хараводам і скокамі а $8^1/_2$ ч. вечара аебудзецца сягоння, 20 чэрвеня, на трэку менскаго т-ва аматарау спорта.

Лічба штодзеных паступленняу у г/б. казначействе за апошнія дні узрасла ад 5,000 до 10,000 руб.

Калі паступленні пойдуць у той жа прагрэссіі далей, то можна спадзевацца аб узабнауленні выдачы пэнсіі пэнсіанэрам, а затым ужо і укладчыкау часьцічна.

Паверхнасная рэстаурацыя Домінікансного касьцела унутрэнняй часьці будзе закончана праз два тыдні.

Увесь расход, як і раней, на грошы набожных католікоу ад простанародзя.

Рэстаурацыяй кірue цяпер інжэнер Краснопольскі.

У дадатак да учорайшай заметкі, аб справах у комісіі па апалу нас просяць надрукаваць, што б. член Управы А. Р. Левітас выехау у Маскву ні па сваей патрэбі, а за паляцэннем Управы.

Цукер і соль выдаецца рэстарацыям 1-го і 2-го разрадау—18 чэрвеня, рэстарацыям 3-го разраду і сталоукам 19-го і 20-го чэрвеня, прыватным —21, 22, 24 чэрвеня.

К самаістнаму падаходкаму у карысьць места налогу можам паведаміць да 15-го ліпня вымагаецца паказываць домауласьнікамі, кватэрауласьнікамі і наогул асобамі маючымі самаістны даход—весткі аб гэтым у падатную інспэкцыю, прычэм за нісвоеочастную падачу або фальшывыя весткі штрафу да 50 руб.

Прыезд Сьвятшэйшаго князя Івана Гэдыміна Бержанскаго Клаусутіса 18 чэрвеня Беларускае народнае прэдстаунічтво адведзіу сьвятлейшы князь І. Гэдымін Бержанскі Клаусутіс, каторы прыбыу у Менск дзеля азнаемлення з палажэннем беларускай справы. Пасьля доугай размовы з прэзыдіумам князь запрапанавау сваю працу на нацыянальняй беларускай ніве.

Гр. Фэрмор, землеуласьнік на Магілеушчыне, прэдстаунік і арганізатар расійскаго «союза земельныхъ собственниковъ», значная хвігура у коле расійскіх монархістау 18 чэрвеня прыехау у Менск, каб абзнаеміцца с тутэйшай сітуацыяй. Гр. Фэрмор быу у Сэкрэтарыяце і меуся зложыць візыт глаунакамандуючаму ф. Фанкельгайму.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаг[о] камандавання за 18 чэрвеня 1918 року.

Заходні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Артылерыя непрыяцеля па нікаторых участках у Фландрыі, па абоіх баках р. Ліс, паміж Аррасам і Альбэра[м] разьвівала ўзмацаваную чыннасьць. Пасьля моцнай арты[ле]рыйскай падгатоўкі піпрыяцель каля поўночы перайшоў наступленне поўночна-захадней Альбер. Ен быу адбіты пакінуў у нашых руках палонных.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

Паўднёва-захадней Нуайона і паўднёвей р. Эн артыле[р]ыйская чыннасьць ажывілася у вячэрні час. Асобны[я] атакі непрыяцеля паўночней Эн і паўночно-захадней Шат[о] Тьерры былі адбіты.

Перпіы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Весткі с краю.

М. Ракау. Менск. губ.

У аднэй тутэйшай карчомцы зьбіраліся тутэйшыя аматоры самагонку піць, у карты іграць, ні даць ні ўзяць як у клюб у якім нібудзь губэрнскім месьце. І вось-жа нідаўно, гэтымі днямі прытрапілося п.п. аматорам такое здарэнне. Сабраліся яны у свой «клюб» мусіць падпілі саматушкі, альбо «кумушкі», як у нас яе завуць, ды захацелі зайграць у карты. Але тут ні маглі пагадзіцца як ім лепі стол паставіць. Адны стаялі каб уздоўж сьвятліцы, а другія каб на поперак. Заспрачаліся, ад спрэчкі перайшлі да лаянкі, а потым адзін франт, Гамаліцкі, выламаў ножку с табурэткі, дый перацягнуў ёй «прэціўніка», Слупкевіча, па плячох. І... пайшлі крывавіцца. Потым астальным с компаньонаў якія ні улазілі у драку удалося разьвясьці аворнікоў, усе выйшлі с карчмы і на гэтым усё б мусіло заспакоіцца, каб выйшаўшай на мястэчко компаніі ні спаткаўся тутэйшы «хвабрыкант» — дастаўшчык саматушкі Карніцкі, каторы толькі—што прывёз з 60 бутэляк самагонкі. Ен узяўшы старану Гамаліцкаго прычапіўся да Слупкевіча і ўзнавіў драку. Слупкевіч, каторому удалося вырвацца памчаўся да комэндапта і разсказаў яму усё. Калі у Гамаліцкаго зрабілі рэвізыю, то знайшлі у яго усю саматушку, каторую і забралі, а за драку і перахаванне гарэлкі прысудзілі яму 25 розаг і штрафу на 100 рублёў.

Вось да чаго даводзя гарэліца і карты. Шкода толькі, што „«хвабрыканту» нічога з гэтай «награды» ні дасталося

Я. М.

Ракоу 14/VI 1918 г.

Вільня. Камітэты помачы пацярпеўшым ад вайны адыграл у нас ад самаго пачатку акупацыі ролю цэнтраў нацыянальнаго жыцця. Такую-ж ролю адыграў і Беларускі Камітэт апрача матэрыяльнай помачы ахвярам вайны, ён ўзяў на сябе працу наладжэння і беларускаго культурна-нацыянальнаго жыцця. Камітэт залажыў у зіму 1915—1916 г. г. у Вільні 6 Беларускіх народных школ і вучыцельскія курсы, ды гэтак зрабіў пачатак усяе школьнае работы. Але мала было закладаць школы і спасобіць вучыцелёў да іх: трэбыло йшчэ даць беларускую кніжку да навукі. І вось, пры беларускім Камітэці быў утворан с прыватных ахвяр фундуш дзеля выдавецкае працы. Камітэт выдаў усе школьныя кніжкі першае патрэбы:

1. Pierśaja ćytanka.
2. Першая чытанка.
3. Rodnyja zierniaty.
4. Zadaćnik—I hod(dwa wyd.).
5, Задачнік—1 год.
6. Zadaćnik— II i III hod.
7. Karotki Katachizm.
8. Karotkaja Historyja Świataja.
9. Jak prawilna pisać pa biela-rusku.
10 Ab trusoch.
11. Biełaruski Kalendar na 1917 h.
12. Biełaruski Kalendar na 1918 h.

Гэтак Беларускі Камітэт за час окупацыі ўлажыў найвялікшы ўклад у беларускую школьную літэратуру, будучы першым і тут, як у справе ладжэння беларускіх школ.

[«Гоман»].

ГОРАДНЯ. Местовы ўрад закупіў на зіму вялікі запас дроў, каторыя будуць прадаваць людзям на карты. Цэна за кубічны сажэнь назначэна 250 марак.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавоцтво «**Т-во Заранка.**»

Друкарня Я. А. Грынблята.